# «Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма...»



Ала НІКІПОРЧЫК,
пісьменніца

**Імя народнага паэта Беларусі Максіма Танка – адно з пазначаных залатымі літарамі ў гісторыі беларускага прыгожага пісьменства. Стогадовы юбілей з дня нараджэння гэтага выдатнага пісьменніка і грамадскага дзеяча толькі яшчэ болей выразна падкрэслівае яго велічнасць.**

Паэзія Максіма Танка заўсёды была і застаецца невычэрпнай крыніцай духоўнасці і мастацтва. Адзін з даследчыкаў творчасці паэта Мікола Арочка прызнаваўся: «Максім Танк – тая паэтычная планета, у стасунку да якой міжвольна адчуваеш сябе «спадарожнікам...» *[1, с. 23]*. Так, яркасць і прыцягальнасць паэтычнай планеты М. Танка якраз і абумовілі высокія духоўныя крытэрыі, якімі ён кіраваўся ў творчасці і жыцці. А яшчэ яна падмацавана неймавернай любоўю да Радзімы. У паэта гэтае паняцце культавае, якое вырастае да духоўна-філасофскага канцэпту («Гэта зямля – нічым не прыкметная», «Аслепшы...», «Вецер Радзімы», «Заўсёды можна знайсці...» і іншыя вершы).

Своеасаблівым жа кодам да творчасці М. Танка можа служыць яго верш «Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма...»:

*Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма,*
*І калі мо не на ўсе песні хопіць*
*Адмеранага лёсам часу, ведай:*
*Я дапяю іх, нават калі буду*
*Пясчынкай на тваіх шляхах*
*бясконцых,*
*Сасной на нарачанскім узбярэжжы*
*Ці жаўруком – прадвеснікам*
*жыцця [2, с. 140].*

Максім Танк як мастак, да таго ж, як ён сказаў сам пра сябе, «вандроўны мастак», заўсёды з сабой «насіў» краявіды Радзімы, якія падчас тугі і суму па Бацькаўшчыне «развешваў... над Гудзонам, / Над Амазонкай, / Над Сенай...» *[3, с. 489]*. Беларусь у М. Танка паняцце персаніфікаванае, асабовае... «Я разгадаць не раз хацеў / Твой дзіўны вобраз...», – такім прызнаннем пачынае паэт верш «Беларусь», напісаны ў 1943 годзе *[2, с. 83]*. І абагульняе далей шматграннасць і разнастайнасць вобразаў: «І толькі ўсюды тваё імя / Мне шэпчуць травы і лісты»... *[2, с. 84]*. Наогул жа ў паэта Радзіма атаясамліваецца з маці, жанчынай, песняй («...Звініш у несмяротнай песні.») І такая сэнсавая повязь прасочваецца ва ўсёй яго творчасці («Беларусь», «Я піў рачную плынь кіпучую», «Кожны дзень» і інш.).

«Максім Танк яшчэ ў маладыя гады выразна адчуў, што «лірыка, як крыніца з зямлі, заўсёды бярэ свой пачатак з біяграфіі самога паэта». Адсюль з усёй непазбежнасцю вынікала, што непаважлівае стаўленне да ўсяго роднага азначае для паэта і адмаўленне яго паэтычнай існіны, самога яго таленту. Вось чаму Максім Танк ужо ў даверасне́ўскія часы недвухсэнсоўна асуджаў «паэзію без радзімы»... – падкрэслівае вядомы літаратуразнаўца Дзмітрый Бугаёў *[4, с. 5]*.

Для М. Танка Радзіма неад'емнае ад чалавечага існавання паняцце, велічнае і святое. Перад тым як вымавіць гэта слова, паэт выконвае шэраг абрадавых дзеянняў: палошча рот крынічнаю вадою, «як сейбіт, выйшаўшы з сяўнёю поўнай» *[3, с. 324]*, кланяецца полю, хмарам, сонцу і г.д. Мы разумеем, што гэта толькі вобразы-метафары. Але яны нараджаюцца з рэалій жыцця, непасрэдна з адносін паэта да прадмета яго паэтычнай размовы, у дадзеным выпадку – да Радзімы.

## ПРА АЎТАРА

НІКІПОРЧЫК Ала Дзмітрыеўна.

Нарадзілася ў в. Капці Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1979). Працавала настаўніцай у школах Мастоўскага і Дзятлаўскага раёнаў, у музеі Максіма Багдановіча ў Гродне, у Гродзенскай абласной бібліятэцы імя Я. Карскага. З 2007 года працуе ў Гродзенскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Аўтар чатырох паэтычных кніг. Выступае з вершамі і літаратурна-крытычнымі артыкуламі ў айчынным і замежным друку.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Чыстыя і святыя пачуцці М. Танка нараджаюць і адпаведныя настрою радкі. У сваіх шматлікіх просьбах-зваротах да асабістага паэтычнага слова творца просіць яго не мяняць «свайго зместу, водгаласу, зіхацення» *[2, с. 396]*, не бранзавець, не сціраццa... Таму асабліва зразумелымі становяцца такія радкі: «Помні заўжды аб зямлі той, / Што нарадзіла цябе...». Сам жа паэт заўжды аб гэтым помніў і падкрэсліваў, пачынаючы ад манументальнага:

*Мне за ўсё даражэй*
*Небазвод нарачанскі,*
*Абапёрты на плечы*
*Вынослівых сосен,*
*На жардзіны расчыненых*
*весніц [3, с. 524],*

і заканчваючы прыцішана-спавядальным:

*Гэта нічога,*
*Што плашч мой і шапку*
*На вешалцы бачыш,*
*Я часта начую і днюю*
*ля сосен сваіх нарачанскіх,*
*Дзе ўсе беды мае,*
*Дзе ўсе радасці мае,*
*Дзе ўсе думы мае [3, с. 498].*

Гэтыя радкі ўспрымаюцца яшчэ і як бясконцае прызнанне ў любові свайму нарачанскаму краю, як прыжыццёвае і пажыццёвае паяднанне з ім: М. Танк і завяшчаў, каб менавіта там узвышаўся яго жалобны чорны крыж... Паяднанне – поўнае і абсалютнае, бо калі б інакш, то наступнага прызнання-адчування проста не адбылося б: «У гэтым лесе адчуваю я сябе параненай успамінамі сасной, / З якой бруіць – замест жывіцы – песня» *[3, с. 437].*

«Танкаўскую музу цяжка ўявіць у адрыве ад нарачанскіх хваль і сосен, ад роднай прыроды», – справядліва зазначыў у свой час паэт Анатоль Вярцінскі *[5, с. 10].* Менавіта падсечаная прылівам нарачанская сасна, якая толькі рэшткай свайго карэння трымалася за грунт, а вяршыняй «над тонню смяротнай» калыхала аблокі, стала для М. Танка сімвалам жыццястойкасці і мужнасці ў цяжкі час ягонага жыцця, калі ўжо было «і дыхаць, і жыць немагчыма» *[6, с. 87].* Ён разумеў, што сам быў тою сасною. Таму яна і ўспаміналася паэту ў хвіліны, якія патрабавалі звышчалавечых сіл, і даравала гэтыя сілы. Таму што сасна тая была самай роднай – нарачанскай. Бо ніякай іншай зрабіць гэта было б не пад сілу. І прадаўжалася жыццё...



Максім Танк

Шум нарачанскіх сосен суправаджаў М. Танка ўсюды. Ён чуў яго і на высокім беразе Віліі... «Хмара пайшла стараной – на Звярынец, на Антокаль. У Закрэце гулка шумелі сосны. І мне здавалася, што шум іх – гэта гоман пількаўскіх лясоў, з якімі я толькі ўчора расстаўся», – запіша М. Танк 16 жніўня 1936 года ў дзённіку «Лісткі календара» *[7, с. 117].* І ў сваіх вандроўках «па зямных і незямных краінах» ён вяртаўся да шуму родных сосен, да сваіх нарачанскіх дарог. Вяртаўся ў маладосці – з Вільні: «Заўтра еду дамоў. Новы год сустрэну ў дарозе, недзе паміж Маладзечнам і Вілейкай, пад сонны перастук колаў цягніка... І ўсё ж люблю я гэту дарогу... асабліва тыя кіламетры, што пралеглі праз Гарадзішчанскі лес. Я кожны раз успамінаю, як мы вярталіся гэтай дарогай з бежанства, і я збіраў са сваёй сястрою Верачкай грыбы. А дзень быў такі ясны ад сонца, ад ягад і мухамораў і ад радаснага пачуцця вяртання на радзіму, хоць гэта слова для мяне тады было яшчэ неразгаданай загадкай, – што я, здаецца, больш такіх дзён і не бачыў» *[7, с. 176].* Вяртаўся пазней, у сталым узросце, з Мінска, нават тады, калі прыпісвалі «спакой і нейкія кроплі», зрываліся з вешалкі капялюш і плашч, за імі адпраўляліся дарожны кій і боты... «Куды гэта яны? – для М. Танка не ўзнікала дылемы. – Ледзь дагнаў іх на нарачанскай дарозе» *[8, с. 111].*

Сны ў паэта таксама былі «нарачанскімі», прычым адпаведна порам года: вясной яму снілася, што ён ідзе з сяўцамі па раллі, летам ён чуў звон касы, восенню – пах верасовішчаў, а зімой – шум пількаўскіх прысад, занесеных снегам. І паэт разумеў, што яны былі той «гаючай травой», якая давала сілы для жыцця:

*А я, знаць, толькі*
*Дзякуючы снам,*
*Што засталіся*
*Ў спадчыне, жыву [9, с. 26].*

І сны, і нават снег (успамінаўся «мінулы снег, забыты, ля пількаўскіх двароў...» *[9, с. 20]*) у М. Танка заўсёды мелі пількаўска-нарачанскую пазнаку, без якой не мог адбыцца верш. «Пількаўшчына! Здаецца, нічога там прывабнага няма. Балоты, пералескі, буі, грэблі, валуны ды крушні... Але ўсё гэта для мяне з'яўляецца такім блізкім, ад чаго, як ад лёсу, нельга ўцячы, каб і хацеў. Вось і сягоння, прачытаўшы пісьмо ад бацькі, як заблукаўшага ў выраі жорава, мяне пацягнула дамоў» *[7, с. 258]*. Гэты запіс, зроблены паэтам у 1939 годзе, яшчэ раз падкрэслівае, наколькі дарагімі былі для яго родныя мясціны. І так было заўсёды. У лісце да Янкі Брыля ад 27 кастрычніка 1960 года М. Танк пісаў з Нью-Ёрка: «Дарагі Янка! Не буду Табе пісаць аб нашым жыцці-быцці, бо ведаеш пра гэта з газет. Таксама ведаеш, што самым шчаслівым днём з'яўляецца дзень вяртання на радзіму»... *[10, с. 39]*.

Ад таго «радаснага пачуцця вяртання на радзіму» (з бежанства) пройдзе шмат дзесяцігоддзяў, і слова Радзіма, якое было тады яшчэ «неразгаданай загадкай», паэт будзе разгадваць усё жыццё... Ці разгадаў?.. А ўвогуле, ці можна гэта разгадаць?..

«Касмічнасць мыслення паэта, планетарны кантэкст бачання і асэнсавання той ці іншай праблемы дзівосным чынам сумяшчаюцца ў яго творах з пластыкай прадметнага аналізу, апеляцыяй да шматлікіх і характарыстычных акалічнасных дэталей. Падкрэсленая грамадзянска-палітычная заангажаванасць многіх вершаў, іх прамоўніцка-публіцыстычны пафас не толькі не адмаўляюць, а наадварот, прадугледжваюць наяўнасць гэтак званай прыватнай канкрэтыкі рэчаў, глыбокае выяўленне складанага і супярэчлівага свету асобы чалавека, раскрыццё яе найтанчэйшых душэўных перажыванняў», – сцвярджае даследчык творчасці М. Танка Мікола Мікуліч *[11, с. 18]*.

Найвышэйшымі духоўна-гістарычнымі каштоўнасцямі для паэта таксама з'яўляюцца «мір і спакой пад небам сінім», «шыпшынавы куст каля ганку», «калоссе шчодрае на ніве»... *[9, с. 17]*. Нельга не заўважыць, што сярод усёй філасофска-сэнсавай і вобразна-метафарычнай разнастайнасці паэзіі М. Танка нейкім асобным лейтматывам праходзіць вобраз зярнят – жыта – калосся як сімвал самага існага, самага сапраўднага і значнага – самога жыцця. Можа таму, што яны могуць суадносіцца толькі з вечнасцю, а паэт заўсёды мысліў вечнымі катэгорыямі... Можа таму, што М. Танк усе вартасці і ісціны мераў «мужыцкім аршынам – працай». Нездарма ж яму сніцца, што ў полі сее жыта («У час сяўбы»):

*Але скуль узяліся на маіх далонях*
*зярняты жыта з грудкамі зямлі,*
*Набраклымі імглой*
*і жураўліным крыкам? [3, с. 582].*



Максім Танк, Пімен Панчанка, Піліп Пестрак на ІІ з'ездзе Саюза пісьменнікаў СССР. Масква, 1954 год

Бо чым больш балючым, як імглой і жураўліным крыкам – спаконвечнымі беларускімі з'явамі, маглі набракнуць гэтыя зярняты?.. Ды і ці маглі яны адарвацца, быць асобна ад грудак зямлі? Магчыма ў каго-небудзь іншага з паэтаў – маглі, але толькі не ў М. Танка. Мастак адчуваў сваю непарыўную сувязь з зямлёй, лічыў, што «Трэба / Хоць раз у год / Прайсці басанож баразною за плугам, / Каб аднавіць / Сваю даўнюю сувязь з раднёй – / Зямлёй, камянямі, травой» *[3, с. 309]*. Менавіта ў «першароднай сувязі з бацькоўскай зямлёй здабываліся і непрыкметна закладваліся «першаэлементы» танкаўскай паэзіі, рэчыўна важкія яе першаасновы, якія на ўвесь час ад маладосці да сталасці пазначаць самабытнай і непаўторнай акрасай паэтыку і стыль буйнога мастака слова», – сцвярджае М. Арочка *[12, с. 15]*. Можа таму паэт і сейбіт у М. Танка – натуры блізкія,

роднасныя, паядналыя адной высокай дзеяй. Таму і пісьменніцкі стол успрымаецца ім як ворыва, а напісаныя радкі – як барозны («Наведванне дома Якуба Коласа»). Тая ж патрабавальнасць, тая ж адказнасць, як у сейбіта, як у аратага.

Тое, што паэт ставіўся да пісьменніцкай працы нават звышадказна, лішні раз пацвярджае дзённікавы запіс ад 23 снежня 1939 года: «На стале ляжыць трэці дзень незакончаны верш. Нейкая штучная нота ўплялася ў яго тканіну. А гэта – як трэшчына на самацвеце. У паэзіі цень праўды не заменіць самой праўды» *[7, с. 225]*.

І можа ні ў кім гэтыя паэт і сейбіт не перапляліся так цесна і непарыўна, як у самім Максіму Танку, і можа ні ў кім яны – адначасна! – так моцна не супрацьстаялі адзін другому, як у Максіму Танку: гэты «лёс неспадзяваны, / Лёс ваганта, песняра, бадзянні / Па зямных і незямных краінах» *[6, с. 15]* і шкадаванне, што сейбіт не адбыўся.

*А я, знаць, змарнаваў свае ўсе дні*
*На справы непатрэбныя, мой брат,*
*Як сейбіта былога памяні*
*Мяне на полі жменяю*
*зярнят [9, с. 149],*

напіша ён брату («Пісьмо брату»), які «застаўся верным плугу і зямлі». У якіх суадносінах тут выступаюць метафара, вобразнасць і жыццёвая праўда – вядома толькі самому аўтару.

У паэта і сейбіта – адзіны лёс, адзінае прадаўжэнне: «Той, хто сеяў зярно, жытам закаласіцца»... Узыдуць калоссем і песні паэта:

*У зямлі не замарнуецца зерне,*
*І песні мае, калі варты таго,*
*Зноў людзям*
*калоссямі верне [3, с. 558].*

Максім Танк да канца сваіх дзён адчуваў сябе паэтам і сейбітам, паэтам і аратаем... Лямех і сціло – як першаасновы жыцця, як адзіная яго ўмова – базіс чалавечага існавання... Паэт – каторы раз! – сцвярджаў гэта сваімі радкамі:

*– Жыву, пакуль на роднае зямлі*
*Мігціць мой нержавеючы лямеш,*
*І ў сэрцы яшчэ цепліцца святло,*
*І з рук маіх не выпала сціло [6, с. 7].*

Паэт застаўся верным да канца «сваім» каштоўнасцям. «Вы бачылі, як жыта каласіцца? – пачынае пытаннем ён верш «Калашэнне жыта». – Перш выплывае адзін / З найбольш адважных / Непаседа-колас, / Разгладзіцца, / Расой прамыўшы вочы, / Уцёршы сонцам твар, / І сябру скажа: / – Прачніся, чуеш! / А той – другім, / Другі – сваім суседзям... / І поле ўсё – / Ад краю і да краю – / У каласах» *[9, с. 96]*. Больш таго, М. Танк узводзіць жытнёвыя каласы на ўзровень святасці, рызыкоўна і крамольна ўзнімаючы іх да вышыні іконы. Тое пытанне (выклікана яно было тым, што, калі садзіліся за стол, заўсёды хрысціліся на чырвоны кут), якое ён не асмеліўся задаць дзеду ў дзяцінстве, прагучала ў 1993 годзе ў вершы «Нерукатворнае дзіва»: «Трэ на каго / Маліцца больш: / Ці да іконаў, / Што купленыя / У кірмашных багамазаў, / Ці да жытнёвых каласоў, / Якія мы збіралі ўсе / На мінным полі...» *[6, с. 4]*. А дзесяць снапоў – бабка на полі – у яго атаясамліваліся з храмам: «Сноп у цэнтры – храма хлебнага падпорка» *[6, с. 10]*. З філасофіі непарыўнасці чалавека і зямлі – і гэтае яго пытанне: «Ці вы ставілі калі на полі бабкі?». Адмоўны адказ на яго можа выклікаць у паэта толькі шкадаванне, бо та-



Якуб Колас, Максім Танк, Максім Лужанін на Нарачы. 1956 год

ды чалавек не зведае «смагі жніўня» – «як пот арашае твар і плечы ліўнем», не адчуе пераліўнага звону сярпоў і кос, бо тады для чалавека застаецца неспасцігальным, «як хлеб пахне ў час вячэры нашай позняй» *[6, с. 10]*. Сам жа паэт гэта добра ведаў: «Сёння цэлы дзень з бацькам абівалі жыта на насевак. З галавы да ног укрыліся пылам, асцём, зярнятамі. Калі пад вечар выйшлі з тока, самі былі падобныя да двух жытніх снапоў» *[7, с. 12]*. Ведаў ён і звон касы. «Па кладках, правальваючыся па пояс у балота, з бацькам ледзь дабраліся да сваё пунькі ў Нявераўскім. Раніца сцюдзёная і такая росная, быццам толькі што яе акрапіў буйны дождж. Прыйшлося раскласці агонь, каб крыху абагрэцца. Потым пракасілі сцежку, каб не таптаць травы, а там – пайшлі класці пакосы ўздоўж Езупавай мяжы. Праўда, у нявераўскіх пакосах цяжка разабрацца, бо тут столькі курганоў, што, каб чыста выкасіць, касой прыходзіцца выраблець сапраўдныя цыркавыя выкрутасы. Але трава – духмяная, лугавая, едкая...», – запіша М. Танк у сваіх «Лістках календара» *[7, с. 209]*. Прыведзеныя дзённікавыя запісы 1938 года, як і гэтая просьба «Вось толькі на шлях мой апошні, пражыты / Сыпнуць не забудзьце хоць прыгаршчы жыта!» *[3, с. 107]*, яшчэ раз яскрава падкрэсліваюць знітаванасць паэта з роднай зямлёй, калоссем, жытам – адвечнымі каштоўнасцямі чалавечага быцця.

Зярняты, жыта, калоссе і як адзіны рад, і як адзіны ўздых – Радзіма... Вельмі лагічна з папярэдніх параўнанняў вынікае амаль кульмінацыйная метафара: родная зямля – кніга...

*О родная зямля!*
*Ты – кніга вечнага жыцця,*
*Не раз я плугам раскрываў*
*Тваё старонкі-скібы*
*І вывучаў па іх*
*Тваю гісторыю,*
*Запісаную валунамі,*
*Крывёй, агнём і потам [1, с. 118].*

Сярод усёй шматпланавасці і маштабнасці тэм паэзіі Максіма Танка тэма Радзімы застаецца дамінуючай:

*Ёсць адна песня песняў –*
*Пра Радзіму.*



У роднай Пількаўшчыне

*Ніхто не знае,*
*Хто яе пачаў,*
*І ніхто не знае,*
*Хто і калі закончыць [9, с. 82].*

Так лаканічна і вычарпальна-ўсёабдымна акрэсліў гэтую тэму творца. І ў гэтай нескан-чонай «песні песняў» голас самога Максіма Танка ніколі не згубіцца, таму што пазначаны ён высокім талентам і светлай душою.

## ЛІТАРАТУРА


1. Мікуліч, М. Максім Танк і сучасная беларуская лірыка / М. Мікуліч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 191 с.
2. Танк, М. Мне пару крыл дало юнацтва: выбраная лірыка / М. Танк; уклад. В. Рагойша. – Мінск.: Маст. літаратура, 2003. – 479 с.
3. Танк, М. Збор твораў: у 6 т. / М. Танк.– Мінск: Маст. літаратура, 1980. – Т. 4. – 720 с.
4. Бугаёў, Д. Выдатны паэт славянскага свету / Д. Бугаёў // Літаратура і мастацтва. – 1982. – 17 верасня.
5. Вярцінскі, А. І становіцца песняй… / А. Вярцінскі // Літаратура і мастацтва. – 1982. – 17 верасня.
6. Танк, М. Errata: вершы / М. Танк. – Мінск: Маст. літаратура, 1996. – 143 с.
7. Танк, М. Збор твораў: у 6 т. / М. Танк. – Мінск: Маст. літаратура, 1981. – Т. 6. – 637 с.
8. Танк, М. Прайсці праз вернасць: вершы / М. Танк. – Мінск: Маст. літаратура, 1979. – 160 с.
9. Танк, М. Мой каўчэг: вершы / М. Танк. – Мінск: Маст. літаратура, 1996. – 207 с.
10. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М. Танк. – Мінск: Беларуская навука, 2011. – Т. 12. – 942 с.
11. Мікуліч, М. Паэзія рэчаіснасці: У свеце Максіма Танка / М. Мікуліч. – Мінск: Маст. літаратура, 2001. – 126 с.
12. Арочка, М. Максім Танк: Жыццё ў паэзіі / М. Арочка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 272 с.